# Раздел 2
# ТЕОРИЯ И ПРАКТИКА ОБУЧЕНИЯ И ВОСПИТАНИЯ

## ДЫЯЛОГ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ З РЭЛІГІЙНЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

**В. А. Адзіночанка**
**ГДУ імя Ф. Скарыны (Гомель)**

Актуальнасць разумення таго, што такое дыялог, і засваення яго механізмаў абумоўлена пераходам ад савецкага грамадства, у якім была дзяржаўная ідэалогія, што прэтэндавала на выраз адзіна правільнага пункту гледжання, да грамадства, якое прадугледжвае магчымасць наяўнасці дыяметральна супрацьлеглых поглядаў, і ў ходзе развіцця якога плюралізм меркаванняў паступова становіцца не толькі нормай, але і патрабаваннем.

Варта ўсведамляць, што для нас праблема наладжвання міжрэлігійнага дыялогу з'яўляецца новай. Яе не існавала ў савецкім грамадстве, паколькі яно жорстка кантралявалася дзяржавай, цэментуючую ролю ў якой выконвала Камуністычная партыя. Згодна з афіцыйным пунктам гледжання, рэлігія лічылася не проста "опіумам народа", але і адзінай легальна існуючай формай камуністычнай ідэалогіі, перaследаваліся ўсе рэлігійныя напрамкі, і таму для іх актуальным было не наладжванне дыялогу, але захаванне сябе ў неспрыяльных умовах.

З пункту гледжання механізму яго ажыццяўлення, дыялог – гэта ўзаемадзеянне паміж людзьмі, якое мае на мэце ўзаемную канфрантацыю і ўзгадненне поглядаў, якое накіравана на сумесны пошук вырашэння праблемы. Яго неабходнай умовай з'яўляецца ўзаемнае прызнанне годнасці бакоў і іх права на іншую пазіцыю. Пры гэтым, у ходзе дыялогу адбываецца выпрацоўка бачання праблемы, якое з'яўляецца прымальным для ўсіх яго ўдзельнікаў.

Дыялог рэлігійных арганізацый з дзяржавай мае, на наш погляд, найменш праблемны характар. Беларускія ўлады ясна і паслядоўна выказваюць сваё імкненне да яго. У якасці прыкладу прывядзем словы былога Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Л. П. Гулякі: «У цяперашні час рэспубліканскія і мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання вядуць канструктыўны і шматпланавы дыялог з рэлігійнымі арганізацыямі, аказваюць магчымую дапамогу ў вырашэнні іх праблем, забяспечваюць канстытуцыйныя правы грамадзян на свабоду сумлення і веравызнання, умацоўваюць этнаканфесійны мір і стабільнасць у гра-

мадстве. У нас у краіне няма канфліктаў на рэлігійнай глебе; узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных канфесій будуюцца на прававой аснове і нацэлены на падтрыманне грамадзянскай згоды» [1, с. 15–16].

Асаблівасцю беларускай Канстытуцыі з'яўляецца тое, што ў ёй адсутнічае прынцып аддзялення царквы ад дзяржавы, і гэта ў нейкай меры таксама можна разглядаць як паказчык дыялогу, паколькі рэлігія прызнаецца часткай публічнай сферы. Дзяржава ставіць на мэце наладжванне ўзаемадзеяння з рэлігійнымі арганізацыямі ў залежнасці ад іх ролі ў фарміраванні беларускай культурнай і дзяржаўнай традыцыі.

Пра гэта гаворыцца ў Прэамбуле закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях». Гэты Закон вызначае прававыя асновы стварэння і дзейнасці рэлігійных арганізацый, зыходзячы з: права кожнага на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, а таксама на роўнасць перад законам незалежна ад стаўлення да рэлігіі; роўнасці рэлігій перад законам; прызнання вызначальнай ролі Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа; духоўнай, культурнай і гістарычнай ролі Каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі; неаддзельнасці ад агульнай гісторыі народа Беларусі Евангелісцка-лютэранскай царквы, іўдаізму і ісламу; неабходнасці садзейнічання дасягненню ўзаемнага разумення, цярпімасці і павагі рэлігійных пачуццяў грамадзян у пытаннях свабоды сумлення і веравызнання» [2].

Культура з'яўляецца адной са сфер супрацоўніцтва беларускай дзяржавы і рэлігійных арганізацый, перш за ўсё, Беларускай праваслаўнай царквы. 2016 год быў абвешчаны ў Беларусі годам культуры. У гэтай сувязі Беларуская праваслаўная царква і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь падпісалі Комплексны план мерапрыемстваў, які ўключаў шэсцьдзесят два сумесных творчых мерапрыемствы, сярод якіх Міжнародны фестываль праваслаўных песнапенняў «Каложскі Благавест» (г. Гродна), Чытанні «Мой род – мой народ» (г. Барысаў), XIII гарадскі Велікодны фестываль (г. Гомель), Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні (г. Мінск), мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня беларускага пісьменства (г. Рагачоў, Гомельская вобласць), мерапрыемствы ва ўстановах культуры, якія раскрываюць ролю праваслаўя ў станаўленні, развіцці і зберажэнні духоўных асноў беларускага народа і іншых народаў усходнеславянскай цывілізацыі, мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне культуры здаровага ладу жыцця, павышэнне культуры шлюбна-сямейных адносін.

Адным з кірункаў палітыкі сучаснай беларускай дзяржавы з'яўляецца захаванне нацыянальнай культурнай традыцыі. У яго рамках аказваецца дапамога рэлігійным арганізацыям у аднаўленні і рэстаўрацыі культавых будынкаў, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі Рэспублікі Беларусь. Выдзелены сродкі на аднаўленне Жыровіцкага Свята-

Успенскага манастырскага комплексу, Успенскага манастыра ў вёсцы Пустынка Мсціслаўскага раёна, Свята-Пакроўскага жаночага манастыра ў Талачыне, касцёла Божага Цела ў Нясвіжы і інш.

Дзяржавай ажыццяўляецца арганізацыйная падтрымка правядзення Міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў», Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў, Міжнароднага фестывалю духоўнай музыкі «Магутны Божа». Распрацоўваюцца маршруты пілігрымак да праваслаўных і каталіцкіх святынь у Рэспубліцы Беларусь. Пры падтрымцы дзяржавы рэлігійнымі арганізацыямі арганізуюцца экскурсійна-паломніцкія паездкі ў іншыя краіны.

Важную ролю ў ажыццяўленні культурнай палітыкі беларускай дзяржавы мае ўручэнне штогадовай прэміі «За духоўнае адраджэнне», заснаванай у 1997 г. Яна рэгулярна прысуджаецца рэлігійным дзеячам, якія належаць да розных рэлігійных напрамкаў, што існуюць у сучаснай Беларусі.

У 2022 г. за вялікі асабісты ўнёсак ва ўмацаванне духоўных каштоўнасцей, самаадданую працу ў сферы асветы і царкоўнай дабрачыннасці прэмія прысуджана протаіерэю, настаяцелю храма іконы Божай Маці «Усецарыца» ў г. Мінску, старшыні Сінадальнага аддзела па царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльным служэнні Кірылу Шолкаву.

У цэлым мы можам канстатаваць, што ў сучаснай Беларусі сфарміравалася ўстойлівая практыка ўзаемадзеяння дзяржавы з рэлігійнымі арганізацыямі ў сферы культуры. У асноўным яна накіравана на захаванне культурнай спадчыны і маральнае выхаванне.

Асабліва трэба сказаць аб узаемадзеянні сучаснай беларускай дзяржавы з рэлігійнымі арганізацыямі ў сферы адукацыі.

Згодна з артыкулам 9 Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» «нацыянальная сістэма адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь носіць свецкі характар і не мае на мэце фарміраванне тых ці іншых адносінаў да рэлігіі» [2].

Пры гэтым настойліва падкрэсліваецца, па-першае, свецкі характар адукацыі, па-другое, роўнасць усіх канфесій. Так, у Праграме супрацоўніцтва паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой на 2020–2025 гг. запісана: «Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларуская Праваслаўная Царква, названыя ў далейшым «Бакі», дамовіліся падпісаць гэтую Праграму супрацоўніцтва ў галіне выхавання дзяцей і моладзі і рэалізоўваць яе ў адпаведнасці з прынцыпамі: узаемнай павагі і неўмяшання ў справы, якія адносяцца да кампетэнцыі Бакоў; свецкага характару адукацыі; павагі правоў навучэнцаў на фарміраванне ўласнай пазіцыі ў адносінах да рэлігіі і правоў бацькоў або асоб, якія іх замяняюць, на выхаванне дзяцей у адпаведнасці з уласным стаўленнем да рэлігіі. Супрацоўніцтва органаў і ўстаноў

адукацыі з Беларускай Праваслаўнай Царквой не мае на мэце ўшчамлення правоў іншых канфесій або грамадзян і не перашкаджае ім у развіцці супрацоўніцтва з сістэмай адукацыі ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам» [3].

Гаворачы аб наступствах ажыццяўлення дыялогу сучаснай беларускай дзяржавы з рэлігійнымі арганізацыямі, варта ўлічваць, што ён можа прывесці не проста да змены месца рэлігіі ў грамадстве, але да змены самога грамадства. Калі рэлігія становіцца адной са сфер грамадскага жыцця, то яна аказвае ўплыў на стан грамадства ў цэлым. Напрыклад, пры прыняцці рашэнняў маральнага характару частка людзей у той ці іншай форме будзе арыентавацца на рэлігійныя нормы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Гуляко, Л. П. Приветствие / Л. П. Гуляко // Святой князь Владимир и Крещение Руси: цивилизационный выбор восточнославянского мира : материалы междунар. науч. конф., Жировичи, 14–15 мая 2015 г. / Институт философии НАН Беларуси ; науч. ред. совет: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Право и экономика, 2015. – С. 15–16.
2. О свободе совести и религиозных организациях [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 17 дек. 1992 г., № 2054-XII : в ред. Закона Респ. Беларусь от 22.12.2011 г. // Бизнес-Инфо / ООО «Профессиональные правовые системы», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2017.
3. Программа сотрудничества между Министерством образования Республики Беларусь и Белорусской Православной Церковью на 2020–2025 годы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://turovobraz.by/docs/s_24/. – Дата доступа: 08.05.2022.


# МЕТОДОЛОГИЧЕСКАЯ РЕФЛЕКСИЯ ЦЕННОСТНОЙ ПРИРОДЫ ГУМАНИТАРНОГО ЗНАНИЯ


**Ю. Н. Кириллов**
**МГПУ им. И. П. Шамякина (Мозырь)**


Ценности в гуманитарном научном знании являются конститутивным основанием как самого социогуманитарного знания, так и воплощающих его социально-гуманитарных практик. Из огромного массива знания необходимо вычленить исследовательскую проблему концептуализации ценностей как формы знания в философии ценностей или аксиологии и в ценностнополагающих гуманитарных науках или практической аксиологии.

Проблема специфики гуманитарного знания, его места в духовной культуре – одна из центральных в современной эпистемологии, осмысления предметно-методологической и парадигмальной специфики